*УДК 94(37)*

# ІКАНАГРАФІЯ І КУЛЬТ ПАЛЬМІРСКАГА БОГА МАЛАКБЕЛА Ў III СТ. Н. Э.

**С. М. Смірноў**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*
*viales89@gmail.com*

Дадзеная праца прысвечана культу і іканаграфіі пальмірскага бога Малакбела. Цікавасць да гэтага пытання выклікана тым, што шанаванне Малакбела сустракаецца не толькі ў рымскай Пальміры, але яго культ прысутнічаў у Рыме і ў Дура-Еўропас (Сірыя). Сярод даследчыкаў існуе меркаванне, што пальмірскі бог сонца непасрэдна звязаны з рэлігійнай рэформай рымскай імператара Аўрэліяна. Такое меркаванне грунтуецца на падабенстве іканаграфіі Малакбела і бога Sol Invictus (Непераможнае сонца) і звестках рымскіх гісторыкаў аб жыцці Аўрэліяна. Выявы бога Малакбела на сакральных помніках антычнай Пальміры і пальмірскіх тэсерах (жэтоны на грамадскія мерапрыемствы), дазваляюць казаць, што іканаграфія гэтага бога не абмяжоўвалася толькі яго салярным аспектам. Малакбел часта выступаў як бог расліннасці і шанаваўся разам з богам месяца Аглíболам. Два аспекты Малакбела не супярэчылі адзін аднаму. Выявы пальмірскага бога дэманструюць пэўную еднасць і неразрыўнасць абодвух аспектаў у міфалогіі рымскай Пальміры. Толькі салярны аспект набліжае Малакбела да Sol Invictus, але нельга сцвярджаць, што пальмірскі бог трансфармаваўся ў Sol Invictus падчас рэлігійнай рэформы Аўрэліяна.

**Ключавыя словы**: Малакбел; Аглібол; рымская Пальміра; іканаграфія; культ; рэлігійны сінкрэтызм.

# ICONOGRAPHY AND CULT OF THE PALMYRIAN GOD MALAKBEL IN THE 3RD CENTURY CE

**Smirnou Siarzhuk**

*Belarusian State University,*
*Nezavisimosti av. 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus*
*viales89@gmail.com*

This article is devoted to the cult and iconography of the Palmyrian god Malakbel. This question is interesting because the veneration of Malakbel is found not only in Roman Palmyra, but his cult was present in Rome and Duro-Europos (Syria). Among historians, there is an opinion that the Palmyrian sun god is directly related to the religious reform of the Roman emperor Aurelian. This opinion is based on the similarity of the iconography of Malakbel and the god Sol Invictus (the Invincible Sun) and the testimony of Roman historians. The images of Malakbel on the sacred monuments of Roman Palmyra and Palmyra tesserae (tokens for participation in public events) suggest that the iconography of this god was not limited only to solar aspects. Malakbel often acted as the god of vegetation and was worshiped together with the moon god Aglibol. But it cannot be argued that the two aspects of Malakbel contradicted each other. The images of this god demonstrate a certain unity and inseparability of two aspects in the mythology of ancient Palmyra. Only the solar aspect of Malakbel brings him closer to the god Sol Invictus, but it is impossible to

say that the Palmyrian god was transformed into Sol Invictus during the religious reform of the emperor Aurelian.

**Keywords**: Malakbel; Aglibol; Roman Palmyra; iconography; cult; religious syncretism.

## *1. Уступ*

Дадзеная праца прысвечана іканаграфіі і культу пальмірскага бога сонца Малакбела. Шанаванне гэтага бога было неад’емнай часткай рэлігійнага жыцця рымскай Пальміры. Духоўная культура гэтага горада дэманстравала яскравыя рысы рэлігійнага сінкрэтызму. Ён праяўляўся ў асаблівасцях пальмірскага пантэона, які стаў прадуктам зліцця розных культурных і рэлігійных традыцый. Пальмірская рэлігія трымалася на мясцовым семіцкім грунце, але рэлігійнае жыццё антычнай Пальміры не магла пазбегнуць уплыву іншых культур, якія надавалі мясцовым вераванням новыя сінкрэтычныя формы [1, с. 28–29].

Цікавасць да іканаграфіі і культу Малакбела выклікана тым, што шанаванне гэтага бога сустракаецца не толькі ў Пальміры, але яго культ прысутнічаў у Рыме і ў Дура-Еўропас (Сірыя) [2, с. 34–52]. Распаўсюд гэтага культу звязаны з тым, што пальмірскі бог Малакбел прысутнічаў у духоўным жыцці выхадцаў з Пальміры, якія служылі ў рымскім войску. Менавіта яны пакінулі пасвячальныя надпісы ў гонар свайго бога ў Нумідыі, Дакіі, Маўрытаніі [3, с. 180–184]. Сярод даследчыкаў існуе меркаванне, што іканаграфія і культ Малакбела маглі паўплываць на рэлігійную рэформу рымскага імператара Аўрэліяна, які пасля свайго паходу супраць Пальмірскага царства ўвёў дзяржаўны культ салярнага бога Sol Invictus (Непераможнае Сонца) [4, с. 193–196; 5, с. 8–10].

## *2. Малакбел – бог расліннасці і сонца ў рымскай Пальміры*

Звычайна лічыцца, што Малакбел быў салярным богам у пальмірскім пантэоне, але дадзенае меркаванне не раскрывае ўсіх асаблівасцей вобразу гэтага бога [1, с. 32–33]. Першапачаткова, Малакбел з’яўляўся богам расліннасці і апекуном аднаго з чатырох мясцовых плямён, што складалі аснову старажытнай Пальміры [2, с. 34–35.; 6; 7].



*Мал. 1. Рэльеф Малакбела і Аглібола з храма Бела ў Пальміры*
*Fig. 1.Relief of Malakbel and Aglibol in the temple of Bel in Palmyra*

Як бог расліннасці Малакбел шанаваўся разам з Агліболам, які быў богам месяца ў пальмірскім пантэоне. Абодва багі часта фігуруюць разам на помніках сакральнага мастацтва Пальміры, а мясцовых надпісы надаюць ім эпітэт "святыя браты" [2, с. 34–35; 7]. Яскравым прыкладам сумеснага шанавання гэтых багоў з'яўляецца рэльеф з храма вярхоўнага бога Бела [2, с. 152; 7] (мал. 1). На гэтым рэльефе прысутнічае выява Малакбела і Аглібола, якія стаяць разам у атачэнні кіпарыса і алтароў з пладамі зямлі, а над імі лунае арол са змяёй у дзюбе. Аглібол мае прамяністы німб і паўмесяц на плячах, а бог без німбу – гэта выява Малакбела, бо за ім стаіць кіпарыс, які лічыўся ў пальмірскіх вераваннях свяшчэнным дрэвам гэтага бога [3, с. 159–160]. Кіпарыс часта фігуруе з Малакбелам на пальмірскіх тэсерах і асацыюецца з яго функцыяй бога расліннасці [6]. На гэтым рэльефе Аглібол мае яскравы вайсковы аспект, бо ён трымае дзіду і носіць меч, а бог расліннасці Малакбел апрануты ў сялянскую вопратку [7; 8, с. 86–103].

Саюз і братэрства двух багоў прадстаўлены на рэльефе, які знаходзіцца ў Palazzo dei Conservatori (Палац кансерватараў) у Рыме [6; 7] (мал. 2). Выява Малакбела і Аглібола на рымскім рэльефе падобна на выяву гэтых багоў з храма Бела ў Пальміры. Два маладыя багі паціскаюць адзін аднаму рукі, а за імі стаіць кіпарыс, які з'яўляецца сведкай прымірэння і братэрства двух багоў. Магчыма, кіпарыс не толькі падкрэсліваў расліны аспект Малакбела, але быў сімвалам саюзу двух багоў. На гэтым рэльефе Аглібол мае паўмесяц на плячах, ён выступае ў вайсковым вобразе, бо трымае ў левай руцэ дзіду. Малакбел - гэта малады бог у сялянскай вопратцы [6]. Выявы багоў на двух рэльефах дазваляюць заўважыць пэўны кантраст паміж імі. Малакбел у сваім вегетацыйным аспекце не мае прамяністага німбу і зброі, а Аглібол – гэта ўзброены ваяр з прамяністым німбам і паўмесяцам на плячах. Існуе меркаванне, што гэты кантраст сведчыць аб пэўным



*Мал. 2. Рэльеф Малакбела і Аглібола. Рым*
*Fig. 2. Palazzo dei Conservatori. Relief of Malakbel and Aglibol. Rome*

лідарстве Аглібола. У саюзе двух багоў, магчыма, ён выступаў як старэйшы брат. На думку А. Сейрыга і Я. Вайса, бог месяца часта з’яўляўся старэйшым братам бога расліннасці і сонца ў міфалогіі народаў блізкага Ўсходу [6; 7]. Арыгінальна выглядае сцэна прымірэння двух пальмірскіх багоў на рэльефе з Хірбет-Рамадана ў Сірыі [2, с. 153; 7]. На гэтым рэльефе Аглібол і Малакбел зноў паціскаюць адзін аднаму рукі, але апошні ўжо мае прамяністы німб. Таму гэтая выява яскрава дэманструе пальмірскага бога ў салярным аспекце, хаця ён застаецца спадарожнікам бога месяца. Магчыма, два аспекты Малакбела як бога расліннасці і бога сонца маглі мець цесную сувязь і не супярэчылі адзін аднаму ў сістэме пальмірскіх вераванняў, хаця салярны аспект пальмірскага бога мусіў з’явіцца пазней [7; 9].

Пальмірскія надпісы ўзгадваюць агульную святыню для Малакбела і Аглібола – Свяшчэнныя сады. Магчыма, гэтая святыня існавала ў ваколіцах старажытнай Пальміры, дзе мясцовае племя сачыла за святыняй і шанавала Малакбела, як племяннога бога [2, с. 36; 4, с. 193–196]. Археолагі не знайшлі гэтую святыню і судзіць аб яе знешнім выглядзе досыць складана. Існуе меркаванне, што агульную святыню гэтых багоў можна ўбачыць на рэльефе з храма Бела, у якім паказана сцэна прымірэння і братэрства Малакбела і Аглібола [7]. Верагодна, гэтая святыня магла быць разбурана рымскім імператарам Аўрэліянам падчас падаўлення паўстання пальмірцаў [4, с. 193–196]. Згодна з візантыйскім гісторыкам Зосімам, рымскі імператар прывёз у Рым статую Геліяса і Бела (Zosimos. Historia Nova (Зосім. Новая гісторыя) 1. 61) [10, с. 90] і стварыў храм сонечнага бога. Магчыма, антычны гісторык меў на ўвазе двух пальмірскіх багоў – Малакбела і Аглібола, але іншыя крыніцы не пацвярджаюць гэтага [5].



*Мал. 3. Рэльеф пальмірскай трыяды вярхоўных багоў. Луўр. Парыж*
*Fig. 3. Relief of the triad of the Palmyrian gods. Paris*



*Мал. 4. Рэльеф Малакбела з храма Баалшаміна ў Пальміры*
*Fig. 4. Relief of Malakbel from the Temple of Baalshamin.*

Салярны аспект Малакбела заўважны на пальмірскім рэльефе з калекцыі Луўра (мал. 3) [2, с. 147], дзе гэты бог мае прамяністы німб і стаіць разам з Баалшамінам і Аглібολам [1, с. 31–32]. Адметна тое, што Малакбел ужо мае мілітарны аспект, бо ён у рымскай вайсковай форме і трымае меч. Аглібол таксама ўзброены і мае прамяністы німб з паўмесяцам. Як бог сонца, але без прамяністага німбу, Малакбел фігуруе на рэльефе алтара з храма Баалшаміна (мал. 4). На дадзенай выяве можна ўбачыць маладога бога, які сядзіць у запрэжанай грыфонамі сонечнай калясніцы. Грыфон часта прысутнічае разам з Малакбелам на розных выявах, на якіх яскрава праяўляецца сонечны аспект гэтага бога [7].

Салярны характар Малакбела можна заўважыць на пальмірскім алтары з Капіталійскага музея ў Рыме (мал. 5 і мал. 6) [2, с. 154–155; 7]. Выявы гэтага алтара цікавы тым, што даюць магчымасць выявіць пэўныя сюжэты міфалогіі пальмірскага бога. Рэканструяваць міфалагічныя ўяўленні жыхароў рымскай Пальміры складана, бо, на сённяшні дзень, не знойдзены помнікі мясцовай рэлігійнай думкі. Прытым на пальмірскім алтары ў Рыме прысутнічаюць пасвячальныя лацінскія і пальмірскія надпісы. Лацінскі надпіс сцвярджае, што гэты алтар асвечаны рымскім ваяром пальмірскага паходжання ў гонар Малакбела або Deo Soli Sanctissimo (Найсвяцейшае Сонца). Надпіс на пальмірскім дыялекце арамейскай

мовы дадае пасвячэнне ў гонар Малакбела і ўсіх багоў Пальміры [2, с. 47–48; 11].



*Мал. 5. Алтар у гонар Малакбела і пальмірскіх багоў. Рым. Капіталійскі музей*
*Fig. 5. Altar dedicated to Malakbel. Rome.*

Першая выява на рымскім алтары ў гонар Малакбела паказвае нам свяшчэннае дрэва кіпарыс, з якога выходзіць дзіця [1, с. 32–33, 7] (мал. 5). Гэтае боскае дзіця трымае на руках казу. Гэты вобраз больш адпавядае архаічным уяўленням пра Малакбела, як бога расліннасці. Каза часта фігуруе разам з Малакбелам на пальмірскіх тэсерах, калі ён выступае ў аспекта бога расліннасці [7, 12]. Другая выява паказвае нам маладога бога, які сядзіць ў калясніцы запрэжанай грыфонамі.

Трэцяя выява паказвае Малакбела ў выглядзе Геліяса, якога суправаджае арол (мал. 6). У гэтай выяве праяўляецца адаптацыя іканаграфіі Малакбела да грэка-рымскай рэлігіі. У такім выпадку, відавочны ўплыў рэлігійных уяўленняў грэка-рымскага свету на вераванні жыхароў і выхадцаў антычнай Пальміры. Апошняя выява на гэтым алтары паказвае Малакбела як бога Сатурна, які лічыўся начным сонца [1, с. 33] (мал. 6.). Малакбел у выглядзе Сатурна з сярпом часта прысутнічае на пальмірскіх тэсерах [7; 12]. Выявы на рымскім алтары ў гонар Малакбела пацвярджаюць думку, што салярны аспект Малакбела не супярэчыў вегетацыйнаму аспекту гэтага бога. Наадварот, абодва аспекты складалі адзіны міфалагічны вобраз гэтага бога, які апісваецца выявамі рымскага рэльефу.




*Мал. 6. Алтар у гонар Малакбела і пальмірскіх багоў. Рым*
*Fig. 6. Altar in honor of Malakbel and the Palmyrian gods. Rome*

### ***3. Пальмірскі Малакбел і рымскі Sol Invictus***

Цяпер варта закрануць пытанне сувязі іканаграфіі Малакбела і Sol Invictus. Імператар Аўрэліян, які аднавіў еднасць Рымскай імперыі, падавіўшы выступленні сепаратысцкіх

утварэнняў (Пальмірскага царства і Гальскай імперыі), увёў дзяржаўны культ салярнага бога (Scriptores Historiae Augustae – Гісторыя Аўгустаў. SHA Aurel. XXV, 4–6) [13, с. 286–304; 14, с. 82–83]. Нумізматычны матэрыял дазваляе казаць пра асноўныя рысы іканаграфіі Sol Invictus. На манетах рымскага імператара Аўрэліяна можна заўважыць выявы салярнага бога ў выглядзе маладога мужчыны, які мае прамяністы німб або карону (Roman Imperial Coinage Рымская імперская чаканка. RIC V. I. Aurelian №№. 6, 17, 54, 61–67, 77–78, 134–137, 154, 157, 248–257) [15, с. 265–294]. Менавіта ў такім вобразе бог Sol Invictus набліжаецца да Малакбела (мал. 7). Выявы Sol Invictus і Малакбела ў салярным аспекце амаль супадаюць. Абодва багі выступаюць як маладыя мужчыны з прамяністам німбам і могуць кіраваць сонечнай калясніцай.



*Мал. 7. Срэбная манета імператара Аўрэліяна. (RIC V. I. Aurelian. №. 54).*
*Fig. 7. Silver coin of the Emperor Aurelian*

Сонечная калясніца Sol Invictus прадстаўлена на манетах рымскага імператара Проба з легендай Soli Invicto (RIC V. II. Probus. №№. 101, 202–208) [16, с. 29, 39] (мал. 8). На гэтых манетах бачны малады бог у прамяністай кароне, які кіруе калясніцай запрэжанай чатырма канямі. У гэтым выпадку можна ўбачыць падабенства іканаграфіі Sol Invictus і пальмірскага Малакбела. Малакбел ў салярным аспекце – гэта ўзброены ваяр. На манетах імператара Аўрэліяна Sol Invictus таксама носіць ваяўнічы характар [17, с. 435–436]. Абодва багі маюць салярны і мілітарны аспекты, якія звязаны адзін з адным, што, у сваю чаргу, збліжае іканаграфіі гэтых салярных багоў.



*Мал. 8. Срэбная манета імператара Проба. (RIC. V. II. Probus. №. 101)*
*Fig. 8. Silver coin of the Emperor Probus*

Але нават дадзенае падабенства іканаграфій Малакбела і Sol Invictus не дазваляе казаць аб іх поўнай адпаведнасці адзін аднаму. Сцвярджэнне, што Малакбел стаў тым салярным богам, які шанаваўся рымскім імператарам, з'яўляецца паспешлівым і не мае добрага абгрунтавання. Сувязь паміж Sol Invictus і Малакбелам заўважна тады, калі Малакбел яскрава выступаў у сваім салярным і мілітарным аспекце. Салярны характар Малакбела ў сакральных помніках пальмірскіх ваяроў прысутнічаў разам з яго аспектам бога расліннасці. Выявы на рымскім алтары, які прысвечаны Малакбелу, сведчаць аб цэльнасці міфалагічнага вобразу пальмірскага бога, які адначасова мае некалькі аспектаў. Гэтыя аспекты пальмірскага бога перацякалі адзін ў аднаго, хаця выявы Малакбела ў яго асноўных аспектах маглі істотна адрознівацца. У іканаграфіі бога Sol Invictus не прысутнічаў аспект бога расліннасці, як гэта было ў выпадку з пальмірскім богам сонца. Салярны бог імператара Аўрэліяна – гэта бог дзяржавы і войска, ён асабісты апякун імператара, аб чым сведчаць легенды на рымскіх манетах (RIC V. I. Aurelian. №№ 61-65; 353) [15, с. 271-272, 305]. Больш верагодна тое, што Малакбел мог паўплываць на фармаванне іканаграфіі Sol Invictus нараўне з іншымі салярнымі багамі імперыі, але не трансфармавацца ў самога Sol Invictus падчас рэлігійнай рэформы рымскага імператара.

## *4. Высновы*

Іканаграфія пальмірскага бога Малакбела паказвае, што гэты бог быў адначасова богам расліннасці і богам сонца. Як бог расліннасці, Малакбел шанаваўся разам з богам месяца Аглиболам, з якім ён меў агульную святыню ў ваколіцах Пальміры. Калі Малакбел меў прамяністы німб або карону, то ён выступаў як сонечны бог. Але два аспекты Малакбела не супярэчылі адзін аднаму, бо яны праяўляліся ў адным міфалагічным сюжэце, у якім Малакбел мае атрыбуты бога расліннасці і бога сонца.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. Шифман И. Ш. Пальмирский пошлинный тариф. Москва: Наука, 1980.

2. Teixidor J. The Pantheon of Palmyra, Leiden: E. J. Brill, 1979.

3. Dirven L. The Palmyrenes of Dura-Europos: A Study of Religious Interaction in Roman Syria. Leiden: Brill, 1999.

4. Watson A. Aurelian and the Third Century. London and New York: Routledge, 1999.

5. Шенцов М. Е. Культ Митры в Риме в III в. И религиозная политика императора Аврелиана: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.03. Белгород: НИУ БелГУ, 2013.

6. Seyrig H. Iconographie de Malakbêl. Antiquités syriennes. In: Syria. Tome 18 fascicule 2, 1937. P. 198–209. DOI: 10.3406/SYRIA.1937.3969.

7. Wais J. Problemy ikonografii Malakbela //Studia Palmyreńskie. 1970. № 4. S. 5–69. DOI:10.11588/DIGLIT.26180.4.

8. Ростовцев М. И. Караванные города. Санкт-Петербург: Нестор-История, 2010.

9. Lukasiak E. Ikonografia Yarhibola // Studia Palmyreńskie. 1974. №5. S. 7–44. DOI:10.11588/DIGLIT.26181.5.

10. Зосим. Новая история / Пер., комм., указ. Н. Н. Болгова. Белгород: Издательство Белгородского государственного университета, 2010.

11. Houston G. W. The altar from Rome with inscriptions to Sol and Malakbel. In: Syria. Tome 67 fascicule 1, 1990. Pp. 189–193. DOI: 10. 3406. / SYRIA. 1990.7139.

12. Brykczyński P. Astrologia w Palmyrze. // Studia Palmyreńskie. 1975. №6–7. S. 47–109. DOI: 10.11588/DIGLIT.26421.7.

13. Властелины Рима. Биография римских императоров от Адриана до Диоклетиана / пер с лат. С. П. Кондратьева. СПб.: Алетейя, 2001.

14. Сергеев И. П. Римская империя в III веке н. э. Харьков: Майдан, 1999.

15. The Roman Imperial Coinage (RIC): in 10 vol. / ed. H Mattingly, E. A. Sydenham. London: Spink&Son, 1936–1994. – Vol. V. Part 1. 1968.

16. The Roman Imperial Coinage (RIC): in 10 vol. / ed. H Mattingly, E. A. Sydenham. London: Spink&Son, 1936–1994. – Vol. V. Part 2. 1968.

17. Амбрамзон М. Г. Монеты как средство пропаганды официальной политики Римской империи. Москва: Институт Археологии РАН, 1995.